**Сутула, Г**. 5000 вёрстаў памяці / Г. Сутула // Веснік Глыбоччыны. — 2009. — 11 лют. — С. 2.

## 5000 ВЁРСТАЎ ПАМЯЦІ

*Гледзячы афганскую хроніку, супрацоўнік інспекцыі па справах непаўн'алетніх Глыбоцкага РАУС, маёр міліцыі Валянцін Рыгоравіч Масальскі думкамі пераносіцца ў далёкі 1985-ы, у скалістае мястэчка пад Баграмам, дзе яму, беларускаму хлопцу з вёскі Прудаўё, давялося служыць. За пяць тысяч вёрст ад дому, у чужой краіне, на мяжы жыцця і смерці, паўтара года, днём і ноччу ён выконваў свій воінскі абавязак і больш за ўсё марыў вярнуцца на радзіму, дзе не трывожыла вайна.*

### Мінск – Ашхабад

Да арміі хлопец паспеў скончыць Прошкаўскую школу і Мінскае тэхнічнае вучылішча. Дзе будзе служыць, у ваенкамаце не сказалі, але па атрыманым сухім пайку, які добра муліў плечы, здагадаўся, што шлях будзе не блізкі. Кіламетр за кіламетрам – даехалі да Масквы, скіраваліся ў бок Ашхабада. Паўднёвая краіна з казак пра Шахерызаду сустрэла нвабранцаў летняй спякотай і суровым армейскім жыццём. У Ашхабадзе дыслацыраваўся мотастралковы полк, на базе якога Валянцін праходзіў «вучэбку». Паўгода займаліся агнявой падрыхтоўкай. Камандзіры не рабілі сакрэту з таго, што салдат рыхтуюць да адпраўкі ў «гарачую кропку» і прывучалі да думкі, што Выпрацаваная рэакцыя на небяспеку і меткасць там змогуць выратаваць не адно жыццё.

### Кабул – Баграм

У Кабул прыляцелі ў лістападзе. Праз дзень-другі Валянцін трапіў у мястэчка Баграм, дзе размяшчаўся ваенны аэрадром, а адтуль – на адзін з блок-пастоў, які знаходзіўся кіламетрах у трыццаці ад яго. Якраз там праходзіла дарога, па якой з Савецкага Саюза ў Кабул ішлі аўтакараваны з тэхнікай, зброяй, гуманітарнай дапамогай для мясцовага насельніцтва. Да таго , паралельна дарозе ў тым жа накірунку цягнуўся трубаправод, па якому на ваенныя аэрадромы і базы перакачваліся тоны авіяцыйнага паліва. Блок-пасты знаходзіліся праз 20 кіламетраў адзін ад аднаго і задачай службы было суправаджаць грузы, ахоўваць іх і паліваправод. Трубы былі даволі тонкія, іх лёгка можна было перасячы сякерай, што і рабілі душманы. Яны разлівалі керасін, падпальвалі яго, а падыходы да дарогі мініравалі.

– Мясцовыя жыхары адносіліся да нас міралюбіва, але ў кішлакі, якія цягнуліся ўздоўж дарог кіламетраў па 6-10, абгароджаныя высокімі глінянымі агароджамі-дуваламі, мы стараліся не заходзіць, бо можна было і на кулю нарвацца, і ў палон трапіць, – расказвае Валянцін Рыгоравіч. – Метады вядзення вайны ў душманаў нагадвалі партызанскія. Аднойчы ўзвод аховы суправаджаў мотакалону. Наш бронетранспарцёр ехаў першы. Раптам за некалькі метраў ад дарогі, у прамым сэнсе слова з-пад зямлі, вылез душман з гранатамётам... Цяжкапараненага нашага камандзіра мы як мага хутчэй даставілі ў шпіталь. А стралок, зрабіўшы сваю справу, нырнуў у выкапаны «калодзеж» і, як крот, знік пад зямлёй. Там у іх нораў накапана па дзесятку кіламетраў пад зямлёй хады-выхады ва ўсе бакі. А ў гарах душманы наогул адчувалі сябе ў небяспецы. Практычна мы кантралявалі толькі працэнтаў пятнаццаць тэрыторыі, на астатняй гаспадарылі яны.

## Паўднёвы рай з прысмакам палыну

Даволі хутка Валянцін зразумеў, што паўднёвы сонечны рай з экзатычнай прыродай на самой справе быў міражом, падманлівым і небяспечным.

– Многія падрываліся на мінах, бо мінашукальнікі іх «не бралі». Калі прыходзілася дастаўляць харчаванне ў горы, дзе стаялі нашы пасты, то ішлі і не ведалі: дойдзем ці не? Аднойчы салдаты нашага ўзвода вярталіся з задання. На вялікай хуткасці бронетранспарцёр наскочыў на снарад і падарваўся. Сябар, з якім Валянцін поплеч нёс службу, загінуў, – успаміны не з прыемных.

Неспакойнымі былі ночы. Душманы абстрэльвалі блок-пасты. У адказ нашы самалёты бамбілі іх укрыцці. Асколкі і кулі не разбіралі, дзе хто, а трэба было выжыць і выстаяць. Што ж падымала баявы дух салдат? Збіраліся цесным сяброўскім колам, спявалі песні пад гітару, пісалі пісьмы дадому, з нецярпеннем чакалі палявой пошты, пра дом успаміналі, дні да «дэмбеля» лічылі – жывым – жывое, жыццёвае.

## «Бяры шынель, ідзі дадому!»

У маі 1987 года сяржант Валянцін Масальскі дэмабілізаваўся. Па дарозе, «засеянай» сотнямі ўзарваных, скурожаных, абгарэлых кузавоў машын, салдаты вярталіся на радзіму. Хлопец без шкадавання памяняў аўтамат на аўтаручку. Скончыў Магілёўскі педінстытут. У 1991 годзе пачаў працаваць у інспекцыі па справах непаўналетніх. За васемнаццаць год ад лейтэнанта міліцыі дaслужыўся да маёра.

Няпростая работа ў Валянціна Рыгоравіча. «Цяжкія» падлеткі, якіх трэба і выхоўваць, і розуму вучыць, і працаўладкоўваць, і ўсяляк аберагаць ад турмы і жыццёвай прорвы, іншы раз не разумеюць той небяспекі, якую нясуць ім іхнія бяздумныя паводзіны. Маёр Масальскі і цяпер – як на перадавой. Адказнасць за юныя лёсы не дае права заспакойвацца.

Прайшлі гады. Тая вайна, дзень за днём, адышла за гарызонт часу. Але яна засталася ў тых пяці тысячах вёрстаў памяці, па якіх і сёння крочаць былыя салдаты Афгана.

**Г. Сутула**